WWW.BAJ.BY

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

СМІ Ў БЕЛАРУСІ


№ 1 (60)
ВЫНІКІ 2019 ГОДА




Вынікі медыйнага 2019 года ў лічбах

2 крымінальныя справы супраць журналістаў і блогераў скончыліся абвінаваўчым прысудам

21 затрыманне журналістаў і блогераў




44 штрафы журналістам-фрылансерам за працу з замежнымі СМІ без акрэдытацыі




18 тыс. еўра – агульная сума штрафаў журналістам за супрацу з замежнымі СМІ

6 недзяржаўных інтэрнэт-рэсурсаў зарэгістраваліся ў якасці СМІ больш чым за год з моманту ўнясення ў Закон аб СМІ палажэння аб рэгістрацыі сеткавых СМІ

Больш як 70 мільёнаў еўра вылучана на фінансаванне дзяржаўных СМІ на 2020 год у рэспубліканскім бюджэце



153-е месца Беларусі (з 180 краінаў свету) у штогадовым Індэксе свабоды прэсы «Рэпарцёраў без межаў»



ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ
СМІ
Ў БЕЛАРУСІ
№ 1 (60)
ВЫНІКІ 2019 ГОДА

Становішча ў галіне СМІ ў 2019 г. (агляд)

Становішча ў галіне СМІ ў 2019 годзе было неадназначнае. З аднаго боку, на яго ўплывала агульная тэндэнцыя ўзмацнення дзяржаўнага кантролю над медыяпрасторай, з іншага – правядзенне ў Мінску II Еўрапейскіх гульняў падштурхоўвала ўлады да большай адкрытасці краіны. Таксама нельга не браць да ўвагі складаную знешнепалітычную і эканамічную сітуацыю ў Беларусі (перамоўны працэс з Еўрасаюзам і ЗША, узрастанне памеру знешняга доўгу і ціск з боку Расійскай Федэрацыі), а таксама выбары ў беларускі парламент (адбыліся 17 лістапада 2019 года).

II Еўрапейскія гульні прайшлі ў сталіцы Беларусі з 21 па 30 чэрвеня 2019 года. Незадоўга да іх правядзення праваабарончая арганізацыя Human Rights Watch заклікала алімпійскіх чыноўнікаў забяспечыць гарантыі недатыкальнасці журналістаў у Мінску:



Dzyanis Kurhan, wikipedia.org

«На працягу апошніх двух год улады Беларусі прадпрымаюць паслядоўныя крокі па ўціску свабоды СМІ, якія наўпрост уплываюць на абстаноўку, у якой журналісты будуць асвятляць

падзеі ў краіне напярэдадні, падчас і пасля Еўрапейскіх гульняў... Еўрапейскія алімпійскія камітэты (ЕАК) павінны забяспечыць магчымасць свабодна працаваць усім замежным і беларускім карэспандэнтам, якія асвятляюць II Еўрапейскія гульні».

Насуперак засцярогам праваабаронцаў і журналісцкіх арганізацыяў, сур'ёзных канфліктаў, якія былі б звязаныя з ажыццяўленнем журналісцкай дзейнасці, падчас Еўрапейскіх гульняў не адбылося. Больш за тое, да пачатку Еўрапейскіх гульняў знізіўся ціск на журналістаў-фрылансераў, матэрыялы якіх з'яўляюцца ў замежных СМІ. Калі за першыя 5 месяцаў 2019 года суды 38 разоў штрафавалі такіх журналістаў за супрацу з замежнымі медыя без акрэдытацыі, то з 31 траўня такая практыка прыпынілася.



Аднак у верасні пасля трохмесячнага перапынку пераслед журналістаў-фрылансераў аднавіўся. У выніку за 2019 год БАЖ зафіксаваў 44 штрафы журналістам-фрылансерам на агульную суму 42049,5 беларускіх рублёў (каля 21 тысячы даляраў ЗША).

Адной з самых галоўных праблемаў у галіне выказвання меркавання ў 2019 годзе быў крымінальны пераслед журналістаў і блогераў.



Абвінаваўчы прысуд галоўнаму рэдактару TUT.BY Марыне Золатавай і завяршэнне «справы БелТА»

4 сакавіка суд Заводскага раёна Мінска прызнаў галоўнага рэдактара вядучага беларускага інтэрнэт-партала TUT.BY Марыну Золатаву віноўнай у бяздзеянні службовай асобы (арт. 425 Крымінальнага кодэкса Беларусі) і прысудзіў яе да штрафу ў памеры 7650 беларускіх рублёў (каля 3800 даляраў ЗША па курсе Нацбанка Беларусі). Акрамя таго, суд спагнаў з яе на карысць БелТА працэсуальныя выдаткі ў памеры 6000 беларускіх рублёў (каля 3000 даляраў).

→ *Асуджэнне М.Золатавай сталася завяршэннем так званай «справы БелТА», узбуджанай улетку 2018 г.*

Прычынай для яе ўзбуджэння сталася несанцыянаванае выкарыстанне некаторымі журналістамі пароляў да падпіснай стужкі сайта дзяржаўнай інфармацыйнай агенцыі БелТА. (Пры гэтым матэрыялы сайта БелТА знаходзіліся ў адкрытым бясплатным доступе і

размяшчаліся тымі СМІ, што патрапілі пад пераслед, з улікам правілаў, якія былі ўсталяваныя БелТА, а паролі да падпісной стужкі не мяняліся гадамі.)

7–9 жніўня 2018 года ў рэдакцыях інфармацыйнай кампаніі БелаПАН, партала TUT.BY, рэдакцыях некаторых іншых СМІ, а таксама ў кватэрах шэрагу іх супрацоўнікаў адбыліся вобшукі. Падчас іх была забраная прафесійная тэхніка і носьбіты інфармацыі. Каля 20 журналістаў былі затрыманыя і дапытаныя следчымі, 8 журналістаў – адпраўленыя ў ізалятар часовага ўтрымання на тэрмін да 3 сутак. У стасунку да 15 журналістаў былі ўзбуджаныя крымінальныя справы паводле ч. 2 арт. 349 Крымінальнага кодэкса (несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі, здзейснены з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці).

Дзеянні следчых выклікалі пратэсты з боку праваабаронцаў, журналісцкіх арганізацыяў і міжнародных структураў (у тым ліку Рады Еўропы, Еўрасаюза, АБСЕ).

Напрыканцы 2018 года крымінальныя справы ў дачыненні да 14 журналістаў былі спыненыя з прыцягненнем іх да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе буйных штрафаў і




svaboda.org

фактычным прымусам іх да выплаты кампенсацыяў БелТА і газеце Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі «СБ. Беларусь сегодня». Адзінай абвінавачанай, прыцягнутай па «справе БелТА» да крымінальнай адказнасці, сталася галоўная рэдактарка інтэрнэт-партала TUT.BY Марына Золатава.

- *«Прысуд і штраф Марыне Золатавай, галоўнаму рэдактару TUT.BY, разам з непрапарцыйнымі захадамі праваахоўных органаў супраць БелаПАН і TUT.BY у 2018 годзе, могуць адмоўна паўплываць на незалежныя СМІ ў Беларусі», — адзначыў прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Арлем Дэзір.*

- *«Тое, як беларускія ўлады настойліва займаліся гэтай справай з самага пачатку, паказвае іх рашучасць зашкодзіць канкурэнтам дзяржаўных СМІ», – заявілі «Рэпарцёры без межаў» пасля асуджэння М. Золатавай.*

Старшыня Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь Валянцін Сукала заявіў, што павышаную грамадскую ўвагу да працэсу над Золатавай – прысутнасць дыпламатаў і рэпарцёраў – магчыма расцаніць як ускосны ціск на суд.



Справа блогера Андрэя Павука

20 сакавіка Следчы камітэт Беларусі ў афіцыйным Telegram-канале паведаміў пра ўзбуджэнне крымінальнай справы паводле ч. 1 арт. 340 Крымінальнага кодэкса паводле факту заведама ілжывага паведамлення аб мініраванні райвыканкама ў гарадскім пасёлку Акцябрскі. Падазраваным па справе стаўся Андрэй Павук, нумар мабільнага тэлефона якога быў указаны ў паведамленні аб мініраванні. 20 сакавіка А. Павук быў затрыманы, у яго ўдома быў праведзены вобшук і былі забраныя кампутар і іншая прафесійная тэхніка.

→ *Паводле версіі следства А. Павук накіраваў электронны ліст у Гомельскае абласное аддзяленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях з паведамленнем аб мініраванні Акцябрскага райвыканкама (мясцовы орган выканаўчай улады). Пасля допыту А. Павук быў вызвалены. Праз месяц крымінальная справа ў дачыненні да яго была спыненая, а сканфіскаваная тэхніка вернутая.*

У траўні гісторыя з ілжэмініраваннем паўтарылася. На электронную пошту МНС паступіла паведамленне пра

мініраванне суда ў г. Мазыр. Падазраваным ізноў стаўся А. Павук. Прычынай таму было, як і ў сакавіку, пазначэнне нумара яго мабільнага тэлефона ў паведамленні пра мініраванне.

Андрэй Павук звярнуўся ва ўпраўленне Следчага камітэта і Генеральную пракуратуру з просьбай высветліць, хто выкарыстоўвае яго асабістыя дадзеныя для лжывых паведамленняў пра мініраванне дзяржаўных установ. Акрамя таго, ён звярнуўся ў суд з позвай да супрацоўнікаў міліцыі, якія парушылі яго правы падчас вобшуку. Ён патрабаваў ад іх кампенсавання маральнай шкоды за затрыманне ў сакавіку па падазрэнні ў ілжэмініраванні.

> *24 верасня, напярэдадні разгляду позвы ў судзе Акцябрскага раёна, блогер атрымаў у месэнджар Viber паведамленне з пагрозамі ад невядомых асобаў:*
>
> *«Заўтра суд, і ты яго прайграеш. Тэма з вобшукам была створана для таго, каб ты задумаўся аб сваіх паводзінах, закрыў свой смярдзючы рот і ўладкаваўся на працу. Скажы дзякуй, што нічога не падкінулі. Калі будзеш займацца сабатажам і ачарненнем існуючай улады, будуць прымацца захады ў дачыненні да цябе. Сядзеш і твая [абраза] жонка будзе перадачкі насіць […]».*
>
> *Аўтар паведамлення да цяперашняга часу не ўстаноўлены.*

4 кастрычніка Андрэю Павуку пазваніў аператыўны дзяжурны РАУС і паведаміў, што ў міліцыю паступіла тэлефанаванне быццам бы з нумара самога Павука, падчас якога невядомы, які назваўся Андрэем і паведаміў яго хатні адрас, паведаміў, што «забіў сваю жонку Вольгу». Жонка Андрэя Вольга была вымушаная тлумачыць, што гэтае тэлефанаванне – правакацыя. У РАУС паведамілі, што «хулігана» знайсці не атрымаецца.

Суд у задавальненні позвы А. Павука да супрацоўнікаў міліцыі адмовіў.



Крымінальны пераслед блогера Сяргея Пятрухіна

18 красавіка суд Ленінскага раёна Брэста прызнаў вінаватым паводле часткі 2 арт. 188 («Паклёп») Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь брэсцкага блогера Сяргея Пятрухіна.

У якасці пацярпелых па справе праходзілі чатыры супрацоўнікі Ленінскага РУУС Брэста (міліцыя). На Сяргея Пятрухіна па рашэнні суда быў накладзены штраф у памеры 360 базавых велічыняў (9180 беларускіх рублёў, што тоесна прыблізна 4600 далярам ЗША), а таксама забавязаў яго выплаціць у якасці кампенсацыі маральнай шкоды супрацоўнікам міліцыі Сяргею Ігнацюку, Дзмітрыю Якушэвічу, Ігару Галянчыцу і Сяргею Токуну ў агульнай колькасці 7500 беларускіх рублёў, што складае каля 3750 даляраў ЗША. Акрамя таго, блогер абавязаны кампенсаваць выдаткі пацярпелых на адвакатаў у памеры 1000 беларускіх рублёў і судовыя выдаткі.

→ *Падставай для прыцягнення блогера да крымінальнай адказнасці сталіся відэаролікі, якія былі зняты ў сакавіку*

2018 года і трансляваліся на YouTube. У гэтых відэароліках С. Пятрухін заявіў аб датычнасці шэрагу супрацоўнікаў Ленінскага РУУС Брэста да збіцця ў міліцэйскім пастарунку ў 2016 годзе грамадзяніна П. Камінскага, які звярнуўся ў праваахоўныя органы з патрабаваннем расследавання інцыдэнта і распавёў аб гэтым блогеру.

Перад пачаткам судовага працэса 14 беларускіх праваабарончых арганізацыяў выступілі з патрабаваннем спыніць крымінальны пераслед С. Пятрухіна. На іх думку, крымінальны пераслед меў палітычна матываваны характар і быў звязаны выключна з рэалізацыяй С. Пятрухіным гарантаваных Канстытуцыяй і міжнароднымі нормамі правоў у галіне правоў чалавека свабодаў – свабоды выказвання меркавання, збору і распаўсюду інфармацыі.

5 ліпеня судовая калегія па крымінальных справах Брэсцкага абласнога суда пакінула рашэнне суда першай інстанцыі без зменаў.

Рейтинги, индексы

У штогадовым Індэксе свабоды прэсы міжнароднай арганізацыі «Рэпарцёры без межаў», апублікаваным у красавіку 2019 года, Беларусь заняла 153-е месца сярод 180 дзяржаваў свету, падняўшыся на дзве пазіцыі ў параўнанні з папярэднім годам. «Пазіцыя Беларусі ў Сусветным індэксе свабоды прэсы 2019 года, здавалася б, сведчыць аб паляпшэнні становішча, – заўважылі «Рэпарцёры без межаў», – але насамрэч яна адлюстроўвае той факт, што становішча значна пагоршылася ў шматлікіх іншых краінах, а таксама той факт, што рэкордная колькасць арыштаў у Беларусі ў 2017 годзе не была паўтораная ў 2018 годзе».

Міжнародная праваабарончая арганізацыя Freedom House ў сваім Рэйтынгу свабоды ў свеце 2019 года, як і раней, аднесла Рэспубліку Беларусь да ліку несвабодных краінаў. Пры гэтым, на думку арганізацыі, ступень свабоды СМІ ў Беларусі ў 2018 годзе паменшылася да мінімальнай.

«Ацэнка паменшылася з 1 да 0 з-за прымянення суворых захадаў у адносінах да журналістаў, якія ўключалі ў сябе новыя абмежаванні, датычныя сеткавых сродкаў масавай інфармацыі, крымінальны пераслед журналістаў, якіх абвінавачвалі ў незаконным атрыманні кантэнту ад дзяржаўнай

інфармацыйнай агенцыі, а таксама частае затрыманне і накладанне штрафаў на журналістаў у сувязі з іх працай».

Камітэт абароны журналістаў (CPJ) уключыў Беларусь у спіс краінаў з найбольш жорсткай цэнзурай (9-е месца).

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

Выдавец:
ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (ГА «БАЖ »).
БЕЛАРУСЬ, 220004, Мінск,
вул. Кальварыйская, 16-265

Тэл.: +375 17 203-63-66, 226-70-98.
Факс: +375 17 203-63-66, 226-70-98.
E-mail: press@baj.by
Web: www.baj.by

Кантакт:
Бастунец Андрэй Леанідавіч,
старшыня ГА «БАЖ»